*Mater Lithvaniae, ora pro nobis!*




# ЛІТВА

**глос монархісты**

**№ 4 (16)**

*МЕСЯЦ КАСТРЫЧНІК - ГРУДЗЕНЬ (СЬНЕЖАНЬ) РОКУ 2002*

ҐАЗЭТА ЗАСНАВАНА Ў 1908 РОКУ, АДНОЎЛЕНА Ў 1995 Р.





## Фэўдальная Рэконквіста

Вось ужо 200 рокаў, як мы жывем у варунках рэвалюцыі. І гэта не перабольшваньне, то радыкальна, а то паступова касуюцца падваліны традыцыйнага грамадзтва. Досыць зірнуць на мапу Эўропы: дзе сёньня Аўстра-Вугорская манархія, дзе Папеская Дзяржава, і дзе нарэшце Вялікае Княства із Рэччупаспалітай? Традыцыйныя сацыяльныя інстытуты, гэткія як станы, касьцел і прафэсыйныя карпарацыі ані граюць значнай ролі. Яшчэ больш прагрэс пачыніла рэвалюцыя ў галіне маральнай: інстытут сям'і на мяжы заняпаду, амаль паўсюдна легалізаванае забіцьцё ненароджаных, на кану эўтаназыя й гомасэксуальныя шлюбы. Якім яшчэ станецца сьвет? Нарэшце прысьпеў час даць на гэта адказ. І гэты адказ мусіць быць традыцыйным – *Фэўдальная Рэконквіста!* Фэўдальная, бо мы ўважаем сярэднявечча эпохай перамогі духу, рэконквіста – з лаціцінскай праз гішпанскую reconquista – знача адваяваньне, вяртаньне належнага.



*Фэўдалізм,* гэта не натуральная гаспадарка, як цвердзяць нам камуністычныя й лібэральныя эканамісты. Фэўдалізм гэта перад усім каштоўнасьці, якія большыя за мэталь: Бог, Гонар, Айчына! Хто сёньня шчэ памятае гэткіх паняткаў? Ці не прысьпеў час распачаць тую духовую барацьбу, каб увесь сьвет, а разам і наша Айчына не апынуліся аднаго дня ў пекле. Для яснасьці паняткаў можна назваць наш рух *фэўдальнай контаррэвалюцыяй,* бо каб спыніць нейкае дзеяньне патрэбнае супрацьдзеяньне: на рэфармацыю – контаррэфармацыя, адпаведна на рэвалюцыю – контаррэвалюцыя. Але наша контаррэвалюцыя не буржуазная, яна нават антыбуржуазная. Як сацыялізм, гэтак і капіталізм чужародныя нашаму разуменьню. Гэтыя паняткі – два бакі аднаго мэдалю, імя якому матэрыялізм. Наша контаррэвалюцыя дзеяньне скрозь духовае, яно мяркуе беспасярэдняю рэалізацыю Божай Волі.

*Фэўдальны Конквістадор* перад усім любіць сваю сям'ю, потым свой род, потым сваю малую радзіму, а потым Айчыну зь вялікай літары. Ён любіць сваю прафэсыю, а не заробак і таму ён задзіночваецца ў карпарацыі для абмежаваньня "ваўчынай" лібэральнай канкурэнцыі, каб кожны, каму гэткі зайнятак падабаецца мог працаваць разам зь ім. Ён належа да свайго стану згодна зы здольнасьцямі й мейсцам, якімі яго абдорыў Пан Бог. Ён ляяльны да справядлівай улады, гэта знача тае, якая паходзіць ад Бога, а не ўзурпуецца паводле канстытуцыі. Ён верыць у Бога, таму што верыць, што ўсё чаго ён мае – мае ад Бога, а пасьля сьмерці здабудзе Рай.

Да чаго мы ймкнемася? Да таго, *каб можна было жыць і ведаць усіх сваіх суседзяў,* каб існавала мяйсцовая грамада, а ня "спальныя мікрараёны". Каб Наша Гаспадарства будавалася на гэтых грамадох, а ня з волі безасабовага "электарату". Каб тут урадваў ані "чырвоны пан", ані "новы рускі", ані "бруксэльскі бюракрат" ані "амэрыканскі F16", але *звыш* дадзены нашаму краю Манарх, зь вернымі яму станамі. Каб людзі жылі вераю не ў "прагрэс", "інтэграцыю", "кар'еру", а ў Бога.

Чаму Літвіны маюць распачаць *фэўдальную рэконквісту?* Таму што ў нас няма шанцаў на йснаваньне на варунках сучаснай цывілізацыі. Аднаўленьне ВКЛ ня можа ўпісацца ў сучасную сыстэму "эўрапэйскай бясьпекі", якая ўлічвае перад усім інтэрасы Вашынгтону, Бруксэлі й Масквы. А панаваньне ў нашай дзяржаве адзінаўладнага Гаспадара – Вялікага Князя не адпавядае "сучаснаму разуменьню дзяржаўнага ладу", дзе ёсьць мейсца толькі для "выбарных" і "калектыўных" органаў улады. У сягодзённым сьвеце, які кпіць з родавай традыцыі няма мейсца для вялікалітоўскай шляхты й ейнае гістарычнай памяці. Таму мы найболей зацікаўленыя ў зьмене гэнкага ўсясьветнага парадку.

Вы запытаецеся ці мажліва ўсё гэта? Мы верым у тое, што Бог ёсьць справядлівым, і кожнаму будзе аддадзена паводле ягоных учынкаў, калі ня ў гэтым сьвеце, дык па сьмерці. Мільёны загінулых на гільятэне й за паўстаньняў, у Сыбіру й Курапатах клічуць аб тым каб учыніць ім задосыць. Гэты момант адцягваецца зь міласэрнасьці Божай, каб маглі пакаяцца тыя, хто да гэнага здольны, але ён неўнікнёны.

***Літоўскі Конквістадор***

ГІСТОРЫЯ

*Тэматам гэтага матэрыялу ёсьць якім чынам вера каталіцкая ўплывала на дзеяньні інсургэнтаў 1863 г., а таксама якім чынам адно найбольш каталіцкае і манархічнае гаспадарства тагачаснай Эўропы – Аўстра-Вугоршчына ставілася да паўстаньня. Дадзеную тэму вельмі грунтоўна распрацаваў польскі дасьледчык Эдвард Валевандэр у сваёй кніжцы "Die цsterreichische Presse und die polnische Januaraufstand" (Аўстрыяцкая прэса і польскае студзеньскае паўстаньне), што была выдадзена па-нямецку ў Франкфурце-на-Майне ў 1991 г.. Грунтуючыся на працы п.Э.Валевандэра, а таксама на іншых апрацоўках, мы спрабуем прааналізаваць, якім чынам практыкаваньне каталіцкай веры паўплывала на матывацыю інсургэнтаў, а таксама якім чынам праявілася міжнародная каталіцкая салідарнасьць з польскім і літоўскім[1] народамі.*

# БОГ, ГОНАР, АЙЧЫНА...

**Гістарычны кантэкст**

Перад тым як перайсьці да чыста веравызнаўчага аспэкту Э.Валевандэр робіць уступ аб прычынах трох падзелаў Рэчы Паспалітай, якія прадвызначылі наступны лёс польскага і літоўскага народаў. Гэтак паводле кансэрватыўнай аўстрыяцкай прэсы - "Tiroler Stimmen[2]" – дысыдэнты[3] ў Рэчыпаспалітай мелі зашмат свабоды і ў канфэсыйных пытаньнях часта зьвярталіся па дапамогу да Расеі ці Прусыі, прасілі чужыя ўлады аб дапамогу і такім чынам заахвочвалі іхняе ўмяшальніцтва ва ўнутраныя праблемы краіны. Гэтыя махінацыі праваслаўных і пратэстантаў паскорылі падзелы Рэчыпаспалітай трыма памежнымі дзяржавамі. Паводле афіцыйнага "Botschafter[4]" штораз большая анархія была асноўнай падставай заняпаду дзяржавы, пакольні якраз яна справакавала умяшаньне іншаземных уладаў. Ва ўспамінах аўстрыяцкай прэсы аб ажыцьцяўляльніках падзелаў зазначалася, што асноўнымі ініцыятарамі былі Кароль Прусыі Фрыдрых II і руская Царыца Кацярына II. Шматлікая прэса падкрэсьлівала асабістую пазыцыю Цэсаровай Марыі Тэрэзыі, якую пацьвярджалі "Tiroler Stimmen": "5 жніўня 1772 году, распусная Кацярына, вальтэрыянскі Фрыдрых II і нейкі Каўніц[5] асудзілі Польшчу на сьмерць, спрычыніўшы вялікі боль нашай шляхэтнай Цэсаровай Марыі Тэрэзыі." Удзел жа самой Аўстра-Вугоршчыны ў падзеле тлумачыўся непазьбежнай неабходнасьцю дзеля падтрыманьня раўнавагі паміж асноўнымі гэапалітычнымі сіламі гэтай часткі Эўропы. У любым выпадку Аўстрыя неахвотна і толькі пад ціскам абставінаў узяла ўдзел у дамове.



*Цэсарова Аўстра-Вугоршчыны Марыя Тэрэзыя - толькі пад ціскам свайго сына Ёзафа II пагадзілася на падзел Рэчыпаспалітай*

Мы ж можам тут зазначыць, што гледзячы з ужо адлеглай пэрспэктывы, апошняя тэза выяўляецца для нашага краю і навакольнага абшару безумоўна карысным вынікам. Калі ўявім сабе, што русінская[6] дзяржаўнасьць утрымалася дзякуючы Львову і Галіцыі, а польская дзяржаўнасьць у новым часе ўзьнікла дзякуючы дзеяньням Юзэфа Пілсудскага таксама на тэрыторыі Галіцыі, а потым распаўсюдзілася і на нашы землі, спрычыніўшы там прынамсі захаваньне фундамэнтальных асноваў вялікалітоўскай цывілізацыі.

**Эўрапэйская гэапалітыка на рэлігійным тле**

Далей польскі дасьледчык зазначае, што ў Аўстрыі, дый у астатніх эўрапэйскіх краінах панавала перакананьне аб непадзельным адзінстве справы рэлігійнай (каталіцкай) са справай патрыятычнай. Менавіта дадзены рэлігійны аспэкт карыстаўся ўсеагульнай падтрымкай усіх пластоў Аўстра-Вугоршчыны. Гэтак "Gemeindezeitung[7]" бачыла ў вырашэньні "польскага пытаньня" розныя зацікаўленыя бакі, але як раз каталіцкі момант быў найбольш спэцыфічны. Падобна "Die Presse[8]" зазначала што найбольшая вартасьць руху палягала ў яго рэлігійнай інспірацыі, гзн. у галіне дзе "грахі" Расеі былі найбольшымі. Гэтыя меркаваньні распаўсюджваліся таксама і на каталіцкае насельніцтва Літвы-Беларусі, не вылучаючы стуль і грэка-каталікоў. Адна з ґазэтаў сьведчыць аб тым, што царскі ўрад "із падступнасьцю, ґвалтам і дапамогай казацкіх кнутоў ды яшчэ некаторых няверных біскупаў" аддзялілі грэка-каталіцкую царкву ад Рыму і далучылі да праваслаўя. "Das Vaterland[9]" з радасьцю паведамляла, што шмат грэка-каталікоў, якіх прымусам далучылі да праваслаўнай царквы, зноў стала патрабуюць быць у адзінстве із Сьвятым Прастолам. Гэта датычыць ня толькі Польскага Каралеўства, дзе выпадкі пераходу грэка-каталікоў у праваслаўе да ліквідацыі Холмскай Дыяцэзыі ў 1875 г. былі досыць спарадычнымі, але таксама Літвы, Беларусі, Падольля і Валыні, дзе Унія пад царскім рондлем[10] была ліквідавана ўжо ў 1839 г[11].

Аўстрыяцкая прэса таксама шмат увагі надавала пазыцыі эўрапэйскіх дзяржаваў адносна паўстаньня, асабліва падкрэсьліваючы нэгатыўную ролю Вялікабрытаніі, Францыі і Прусыі. Пазыцыю Аўстрыі яны разглядалі як спачувальную, грунтуючы такі погляд на падставе таго, што асноўным матывам паўстаньня быў матыў рэлігійны, моцна заціскаены праз пануючае ў Расеі праваслаўе, ці пратэстантызм у Прусыі. У Аўстрыі ж панавала каталіцтва і таму палякі мелі мажлівасьць свабодна вызнаваць сваю веру.

У вялікай частцы можна пагадзіцца, што аб'ектыўна ўмовы існаваньня польскай каталіцкай меншасьці і русінскай грэка-каталіцкай у аўстрыяцкім заборы[12] Рэчы Паспалітай у параўнаньні з умовамі існаваньня каталіцкага насельніцтва на тэрыторыі Надвісьленскага і асаблівага Паўночна-Заходняга краю былі безумоўна нашмат лепшымі.

Зразумець, чаму паўстаньне не магло сустрэцца з абсалютнай, стопрацэнтнай падтрымкай іншых краінаў, дазваляе аналіз тагачаснай міжнароднай сытуацыі. Яна мела сваю крыніцу ў рэвалюцыях у Францыі і Эўропе 1789, 1830 і 1848 гг. Улады Прусыі, Аўстра-Вугоршчыны баяліся новага рэвалюцыйнага выбуху, Папская Дзяржава змагалася зь лібэральна-атэістычным[13] і антыпапескім рухам за аб'яднаньне Італіі[14]. Таму любая зьмена статус-кво разглядалася тагачаснымі ўрадамі, як крок у кірунку рэвалюцыі, гэтак жа як і паўстаньне 1863 г. Гэапалітычны аспэкт праблемы палягаў на тым, што Расея нягледзячы на унутраны звышкансэрватызм на базе лёзунга "Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасьць!" у міжнароднай палітыцы была звышцынічная, падтрымліваюцы нацыянал-рэвалюцыйныя групоўкі ў Сэрбіі, Босьніі, Гэрцэгавіне, Баўгарыі, прызнаючы лібэральнае Італьянскае Каралеўства. Таму такое агульнае паняцьце, як падтрымка "Захаду", якое функцыянуе і сёньня ня мае найменшага сэнсу. Больш можна разважаць аб падтрымцы паўстаньня тымі ці іншымі эўрапэйскімі палітычнымі сіламі: лібэральна-рэвалюцыйнымі ці захаваўча[15]-традыцыяналістычнымі.

Належыць адзначыць, што ў нашым краі навукоўцы ўсё яшчэ працягваюць апісваць тыя падзеі ў скажоным кантэксьце, які быў усталяваны камуністычнай прапагандай. Сэнс кантэксту тлумачыцца тым, што будучы аўтарытарнай унутры краіны савецкая ўлада карысталася ў міжнародным, ды ў пэўным сэнсе і ў нутраным абегу лібэральна-дэмакратычнай рыторыкай. Гэтаму служыў той факт, што савецкая улада зьяўляецца непасрэднай спадчыньніцай лібэральных рухаў XIX сталецьця ў Расеі і за мяжой, бо бальшавізм ёсьць ня што іншае, як радыкальны рух за ґвалтоўнае ўсталяваньне каштоўнасьцяў за якія выказваліся лібэралы ў ідэалёгіі і філязофска-рэлігійнай сфэры. Згодна з дадзенай вэрсыяй паўстаньне 1863 г. прадстаўлялася як рэвалюцыйны выбух скіраваны супраць самадзяржаўя і манархічнага ладу як такога, падтрыманы "прагрэсыўнымі" коламі Захаду. Іншы бок кантэксту, а менавіта безумоўная каталіцкая набожнасьць паўстанцаў, удзел у паўстаньні каталіцкіх ордэнаў і ніжэйшага клеру, маральная

ГІСТОРЫЯ

падтрымка з боку Папскай Дзяржавы і кансэрватыўнай Аўстра-Вугоршчыны старана камуфляваўся.

**Пабожнасьць паўстанцаў і удзел у ім клеру**

Дык вось жа нягледзячы на досыць моцны сацыяльны аспэкт паўстаньня, які акцэнтаўваўся найболей “чырвонымі”, яно мела пераважна рэлігійны характар, што даводзяць дарэчы настолькі розныя крыніцы, як выказваньні правадыра “чырвоных” Канстантага Каліноўскага[16], гэтак і сьведчаньні аўстрыяцкай прэсы. Як сьведчыць Э.Валевандэр “Шматлікія часопісы зьвярталі ўвагу на глыбокую



*Блаславеньне касінераў*

надзею паўстанцаў на помач Божую, а іхні дух малітвы за памысны лёс распачатага паўстаньня[17]. Прымаючы прысягу паўстанцы забавязваліся бачыць перад усім у Богу свайго прыхільніка. Яны ішлі ў бой галосячы імя Пана[18]. Такая пабожнасьць, якая зьвязана са звычайнымі рэлігійнымі практыкамі, была моцна прасякнута марыянскім культам. Паўстанцы бачылі ў Найсьвяцейшай Марыі Панне сваю “адзіную прававітую Каралеву”, дзеля адданьня чэсьці каторай, яны забавязваліся ня толькі зьдзяйсьняць чыны, але і даць жыцьцё ў ахвяру[19]. У песьнях, што сьпяваліся яшчэ перад паўстаньнем, найчасьцей можна было пачуць імя Марыі. Паўстанцы разьлічвалі на перамогу за помаччу Маткі Боскай[20]...У газэтах зьяўляліся апісаньні рэлігійных практыкаў паўстанцаў, прыкладам супольнае чытаньне малітваў у абозах[21]. Пасьля бою сьвятар заклікаў да падзякучыннай малітвы. Усе кленчаць, кіраўнік аддзелу падаваў прыклад і кленчыў на чале сваіх жаўнераў[22]. Паўстанцы часта прыступалі да сакрамэнтаў споведзі і сьвятой камуніі[23].”

Прэса прысьвячала асаблівую ўвагу асобным сьвятарам, якія былі кіраўнікамі паўстанцкіх аддзелаў. Найбольш пісана пра кіраўніка паўстаньня на Літве і Жмудзі, кс.Антонія Мацкевіча (1826-1863). “Postęp” пісаў, што Мацкевіч, як мучанік за нацыянальную справу атрымае ад Бога такую заплату, якая належыцца толькі сьвятым. Менш пісалася пра вельмі вядомага кіраўніка паўстаньня на Падляшшы кс.Станіслава Броску (1822-1865). Напрыклад яшчэ ў сьнежні 1864 г. было паведамлена, што гэты сьвятар разам з часткай свайго аддзела працягвае змагацца, хаця гэта не адпавядала рэчаіснасьці. Было таксама заўважана, што Броска мае амаль роўную сьвятым пашану сярод мясцовага люду. Шмат пісалася аб капэляне аддзелу Дыянізыя Чахоўскага, кс.Марцэлію Шыманскім, які запальваючымі прамовамі заклікаў паўстанцаў да малітвы і барацьбы за сваю Каталіцкую Веру і Айчыну. Прэса падкрэсьлівала, што каталіцкія сьвятары пасьвячалі аддзелы і штандары паўстанцаў.

Трохі ўвагі было прысьвечана таксама і ордэнскім сёстрам. У Тыролю ў лютым 1863 г. было паведамлена, што тры сястры, якія ехалі з Пэтэрсбурга ў Літву, спрабавалі перамыціць запакаваны куфар з косамі. У паведамленьні падкрэсьлівалася сьмеласьць і адданасьць сясьцёр, што зрабіла вялікае ўражаньне.

**Ордэны, мясцовая касьцельная герархія і Сьвяты Прастол**

Немагчыма пераацаніць ролю каталіцкіх ордэнаў пры арганізацыі і ўдзеле ў паўстаньні. “Der Botschafter” зілюстраваў гэта наступным чынам: “Немалая колькасьць тых манахаў, якія зь мячом у адной руцэ, з крыжом у іншай заклікалі ў Імя Езуса Хрыстуса люд да барацьбы, якія вялі паўстанцкія аддзелы на масакру[24]. Э.Валевандэр зазначае, што ад 20 да 70% манахаў у залежнасьці ад ордэнскай кангрэгацыі, у той ці іншай ступені і форме падтрымлівалі паўстаньне. Гісторык Ордэну Капуцынаў К.Гадач лічыць удзел свайго ордэну ў паўстаньні за найбольш хвалебную старонку ордэнскай гісторыі. Але асаблівую вядомасьць атрымалі бэрнардынцы з прычыны іх ахвярнага ўдзелу ў паўстаньні.

Вядома такая пазыцыя манахаў выклікала жорсткія рэпрэсыі царскай улады. У якасьці асноўных прычын прашукваньня ў кляштары Айцоў Паўлінаў у Чэнстахове, “Innsbrucker Nachrichten”[25] называлі казаньні, якія запальваюць народ да супраціву Маскве, а таксама высылку зброі паўстанцам. Мураўёў у Вільні разьмяшчаў казармы і шпіталі ў кляштарах, скуль манахі былі перамешчаны[26]. У такіх умовах 27.X.1864 быў выдадзены касацыйны акт на кляштары. Гэты акт быў ня толькі актам помсты для ордэнаў, але і сродкам “забесьпячэньня” царскага рэжыму[27]. Як паведамляе Э.Валевандэр ліквідацыя кляштараў выглядала прыкладна наступным чынам. Уся акцыя павінна была адбыцца 15/16 (27/28[28]) лістапада 1864 г. адначасова па ўсёй тэрыторыі Каралеўства Польскага і Паўночна-Заходняга Краю. Апоўначы ў канкрэтным кляштары зьяўляўся афіцэр з аддзелам жаўнераў, будзіў і загадваў зыйсьціся зануранах у сон манахаў ці манашак, далей даваў ім для азнаямленьня пастанову ўрада і тлумачыў, што яны павінны быць гатовымі неадкладна пакінуць будынак. Ён таксама прапаноўваў ім пераехаць у іншы не абняты касацыяй кляштар, альбо выехаць за мяжу, на што ўрад даваў ім фінансавую дапамогу. Манахі, якія былі гатовыя выехаць за мяжу атрымлівалі замежныя пашпарты для выезду ў Італію, Аўстрыю, Прусію альбо іншыя нямецкія землі, такіх штопраўда было вельмі мала. Пратэсты Рыму супраць касацыі засталіся без увагі. Напачатку пратэставалі таксама і

*Польская газэта ў Аўстрыі «Postęp»*



POSTĘP

*Газэта «Sonntagsblatt für alle Stände»*



Sonntags-Blatt

für alle Stände.

Nr. 3. 1864.

працяг на 5-й старонцы

НАША ВЕРА

*Рыцарове!*
*Я Каталік! Не схізматык няверны!*
*Я пачуваю ся думным а пэўным!*
*Годна нясу меч Крыжовых Выправаў*
*Супраць шатаньскіх пачварных навалаў!*
*Перад уладай Касьцельнай Сталіцы*
*Ляснуць няверныя скорана ніцма!*
*Я вязнаймую паўсюдна й дазваньня*
*Езуса волі павек панаваньня!*
*Спрэс залунаюць Сьцягі Тамплiераў!*
*Майма ж у сэрцы валечнае Веры!*

*Верны Тампліер.*

# МАДЭРНІЗМ, АЛЬБО ФРАНЦУСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ Ў КАСЬЦЁЛЕ

*(працяг з нумару 3/15 "Літвы" AD 2002)*

*Трываючы на варце традыцыі ў сьвецкім жыцьці, адыж[1] немажліва вабмінуці ўвагаю пытаньняў веры, бо кожнае дзеяньне, якога чалавек спараджае мае сваёй крыніцаю злога альбо добрага духа – Шатана чы Пана Бога. Гэты артыкул распавядае як пачаў ся заняпад "сакрум" і да чаго ён вядзе. Працягваючы яго публікацыю мы ня маем на мэце ўчыніці шкоды ані якім-кольвек дастойнікам Касьцела ані вернікам, але хочам шчыра разважыць – чы ад нашай сьвятой каталіцкай веры чагось яшчэ ў XX ст. застало ся?*

*Сустракаючы ся й размаўляючы зь людзьмі далёкімі ад Касьцела почасту спасьцерагаеш[2] натуралёвага неразуменьня. Кажучы пра прыхільнікаў у нашым змаганьні за традыцыю, яны безумоўна згадваюць Каталіцкага Касьцела, які іхнай думкаю апрыёры мусіць падтрымваць падобных памкненьняў ды трывае скрай кансэрватыўным арганізмам. Вось жа на гэткія выказваньні мы вырашылі нарэсьце вадпавясьці, іж сёньні Касьцел ня ёсьць ані нашым прыхільнікам, ані зычліўцам. Як гэтак стала ся?!*

Памёр верны традыцыі сьв. памяці Піус XII, а на зьмену ўзыйшоў Папеж Ян XXIII. Нешта містычна д'ябальскае ёсьць у тым, што зноў было ўзгаданым гэтае спалучэньне Ян XXIII. Гісторыя ўжо ведала воднага Яна XXIII – антыпапежа Бальтазара Косу – лотра й гвалтаўніка. Папеж Ян XXIII нажаль ня выдаў новай антымадэрністычнай бульлі, ня вычуў усяе небясьпекі наступу ворага. Ён склікаў сабор.

**Філязафічныя падставы Aggiornamento**

Ськлікнуўшы Сабор Папеж абвясьціў свой дэвіз: "Aggiornamento", што ў разгорнутым тлумачэньні азначае: дапасаваньне да зьменных умоваў сёньняшняга часу! Даноса Кортэз, знаны гішпанскі філёзаф апошняга стагодзьдзя канстатаваў: наш час абцяжараны двума заблуданьнямі[3]. Першае заблуданьне стасуецца да Бога, другое да людзей. Што датычыць першага, то тутака ёсьць пасягальніцтва на прысутнасьць Бога ў гэтым сьвеце. Ён замяняе хрысьціянскі, біблейскі, традыцыйны вобраз сьвету на дэістычны, на ідэю Бога, які зыйшоў на супакой і кінуў сьвет на адвольнасьць лёсу і ўласнага разьвіцьця. Бо калі Бог зьяўляецца толькі сыстэмай думак, абстрактнай ідэяй і ён не мяшаецца ў жыцьцё канкрэтных асобаў, ані народаў, тады няма якога-кольвек ачалавечаньня Бога. Тады няма ані царквы, ані ахвяраваньняў, ані камуніі, ані абвяшчэньня. У такім выпадку гэта толькі культурная зьява. Другое заблуданьне, кажа Даноса Кортэз, датычыць людзей. "Чалавек, - гэтак кажа наш прасьвечаны[4] сучасьнік, - добры, лагодны, ён не абцяжараны грахамі, ён прыняты незаплямлёны, народжаны незаплямлёны. Таму яму непатрэбна выратаваньне, яму патрэбна толькі выхаваньне і выяўленьне добрых задаткаў, закладзеных у ім самім". Чалавек не патрабуе пакуты, самавырачэньня, умярцьвеньня альбо адвагі. Усялякі чалавек вельмі добры, гуманістычны, міралюбівы і ветлы. Гэты пастулят далей быў прыняты ў філязофіі і перад усім сёньняшняй тэалёгіі. У выхаваньні адмаўляюцца ад прынцыпа



*Раней чэсьць нележала толькі Пану Езусу, зараз яе аддаюць ідалам гэтага сьвету*

аўтарытэту, устрымліваюцца ад барацьбы супраць шкодных уплываў, супраць грахоўнасьці і зла, адмаўляюцца ад вострых заўвагаў і пакараньняў. У палітыцы даходзяць да таго, што вобразы ворагаў згладжваюцца і камуфлююцца, і ўсё зводзіцца да ілюзорнага пацыфізму. У грамадзкай думцы гэта прыводзіць да бязьмежнай веры ў прагрэс, неўтаймаванага аптымізму, які палягае на ўнівэрсальных мажлівасьцях згоды і задзіночаньня людзей. З гэтага вынікае, што рай на зямлі мажлівы.

**Фактычныя памылкі II Ватыканскага Сабору**

Vaticanum II[5] не зрабіў нічога іншага, як зацьвердзіў, кадыфікаваў агульны вобраз мысьленьня сучаснасьці і лібэралізму і прыняў яго ўнутры Касьцёла. Практычныя хібы дакумэнтаў II Ватыканскага Сабору палягаюць у наступным:

- адвечная праўда не падкрэсьліваецца пэўна і не даецца вырак на заблуданьні;
- прыняцьцё двухсэнсоўных паняцьцяў, якія дапушчаюць разнастайныя тлумачэньні;
- існуюць выказваньні на мяжы гэрэзыі.

Сьведчаньнем першага ёсьць "Дэклярацыя аб рэлігійнай свабодзе", дзе ў раздзеле 6 гаворыцца: "Урэшце цывільная ўлада павінна клапаціцца аб тое, каб ніколі, ці адварта, ці скрыта, не была парушана з прычынаў зьвязаных з рэлігіяй роўнасьць грамадзян у галіне права, якая ўсё ж належыць да супольнага дабра грамадзтва, і каб сярод грамадзян ня мела мейсца дыскрымінацыя. З гэтага вынікае, што нягодна пaступае публічная ўлада, калі з дапамогай сілы альбо страху, альбо іншых сродкаў хоча накінуць грамадзянам вызнаньне альбо адкіданьне якой-кольвек рэлігіі альбо перашкодзіць каму-кольвек ва ўступленьні ў рэлігійную супольнасьць альбо ў выхадзе зь яе. Тым больш выступаюць супраць волі Божай а таксама сьвятых праў асобы і сям'і народаў, калі якім-небудзь чынам ужываюць сілы з мэтай зьнішчэньня альбо абмежаваньня рэлігіі ці то ва ўсім чалавецтве, ці то ў якімсь краю альбо акрэсьленай групе людзей."

Для параўнаньня прывядзем вытрымку з энцыклікі Піуса IX Папежа Quanta cura з 1864 г.: "А хаця мы й ня марудзілі з тым, каб таго роду памылкі часта вызначаць і іх адкідаць, аднак жа справы Касьцёла каталіцкага і збаўленьне душ нам давераных, а таксама дабро самой людзкай супольнасьці агульна вымагаюць, каб мы паўторна скіравалі Ваш пастырскі клопат на асуджэньне іншых недарэчных думак, якія выніклі з тых самых памылак як быццам бы са свае крыніцы. Тыя

працяг на 5-й старонцы

НАША ВЕРА

працяг з 4-й старонкі

фальшывыя а ілжывыя погляды павінны быць тым больш асуджаныя, бо тое маюць на ўвазе, каб быў паменшаны і зусім зьнішчаны той збаўленны ўплыў, які Касьцёл каталіцкі з пастанаўленьня і наказу свайго Боскага Закладальніка павінен, без усялякіх перашкодаў, ажыцьцяўляць ажно да сканчэньня сьвету, як на асобных людзей, гэтак таксама на нацыі, народы і іх уладароў, а таксама паколькі гэтыя погляды імкнуць да таго, каб зусім была ліквідавана сувязь і ўзаемная лучнасьць паміж Уладай Касьцельнай і Уладай сьвецкай, якія для інтарэсаў аднаго і другога боку заўжды аказваліся карысныя і з пажыткам.”

Відавочна, што “Дэклярацыя аб рэлігійнай свабодзе” акцэнтуе сваю ўвагу на недапушчальнасьць сілай накідваць якую-кольвек рэлігію, альбо перашкаджаць у вызнаньні якой-кольвек рэлігіі, у той час як у энцыкліцы Піуса IX Папежа акцэнтуецца “узаемная лучнасьць паміж Уладай Касьцельнай і Уладай сьвецкай”, якая ёсьць карыснай для абодвух. Нібы няма яўнай супярэчнасьці!? Аднак жа ёсьць! Бо што гэта ёсьць лучнасьць паміж уладамі Касьцельнай а сьвецкай, як не абавязак улады сьвецкай да абароны Сьвятой Каталіцкай Рэлігіі, не якой-кольвек, але менавіта Каталіцкай! І як за гэтай абаронай ня можна дазволіць легальнае ўжыцьцё сілы? Ці ўлада ўжо надарма свой меч носіць? Ці аўтары “Дэклярацыі аб рэлігійнай свабодзе” думалі, што яны на месяцы жывуць, дзе няма Д’ябла і яго дзела, дзе няма сэктаў, вычварэнцаў і проста разбэшчаных людзей, дзе сам Swięty Spokyj прабывае. Аджа забыліся, што на зямлі няма раю, а таму Касьцёл патрабуе ва ўласнай абароне сьвятых рыцараў.

Наступны прыклад сьведчыць аб наяўнасьці няясных і небясьпечных для каталіцкай веры сфармуляваньняў. Цытуем “Дагматычную Канстытуцыю аб Касьцёле “Lumen gentium”, раздзел 8: “Гэта ёсьць адзіны Хрыстусовы Касьцёл, які мы вызнаем у Сымбалю веры як адзіны, сьвяты, каталіцкі і апостальскі, які Збавіцель наш па зьмёртвыхустаньні сваім даверыў пасьвіць Пятру, даручаючы яму і астатнім Апосталам, яго пашыраць і ім кіраваць, і які заклаў на вякі як “фундамэнт і падваліну праўды”. Гэты Касьцёл, усталяваны і зарганізаваны на гэтым сьвеце як супольнасьць, трывае (subsistit) ў Касьцёле каталіцкім, якім кіруе наступнік Пятра і біскупы, што застаюцца зь ім у супольнасьці (communio), хаця і паза яго арганізмам знаходзяцца шматлікія карані усьвячэньня і праўды, якія як праўдзівыя дары Касьцёла Хрыстусовага нахіляюць да каталіцкай еднасьці.”

У дадзенай фармулёўцы прысутнічае вельмі небясьпечнае слова “трывае” (у лацінскім тэксьце subsistit), якое закладае, што Касьцёл Хрыстусовы, хаця і трывае таксама ў Касьцёле Каталіцкім можа тэарэтычна трываць адначасова і ў іншай супольнасьці, аб чым сьведчыць далейшы працяг тэксту аб “шматлікіх каранёх усьвячэньня і праўды”. Супрацьпастаўляюцца і аддзяляюцца адно ад аднаго два фундамэнтальныя паняцьці Касьцёл Хрыстусовы і Касьцёл Каталіцкі, што ёсьць тож самае. Адмаўленьне гэтае тожсамасьці і зьяўляецца выказваньнем гэрэтычным.

**Qvo Vadis Modernismus?**

Чым небясьпечны мадэрнізм? Перад усім сваёй схільнасьцю да сынкрэтызму[6], наступным крокам пасьля чаго будзе атэізм. Сёньня ўжо відавочныя азнакі гэтага ў эўрапэйскіх краінах. Яны ўсё болей і болей захлынаюцца навалай рэлігійных сэктаў, веравызнаньняў усходу і проста рэлігійнай абыякавасьцю. Прывядзем некаторыя лічбы.
Гэтак у Францыі:

- колькасьць ахрышчаных: у 1990 г. – 84%, у 1996 толькі 58%;
- рэгулярна хадзілі ў Касьцёл: 1948 г. – 37%, 1958 г. – 35%, 1968 г. – 25%, 1988 г. – 13%[7];
- касьцельны шлюб бралі: 1980 г. – 65% сужэнстваў, 1996 г. – 50%;
- колькасьць сьвятароў: 1978 г. – 40300, 1980 г. – 38676, 1985 г. – 36203, 1992 г. – 32267.

З 79% каталіцкага насельніцтва Францыі 66% - веруючыя, гзн., што сярод 27% французаў, якія лічаць сябе атэістамі, 14% - “каталікі”. Лічбы гавораць самі за сябе, але ня трэба думаць, што падаць далей

працяг на 6-й старонцы

ГІСТОРЫЯ

# БОГ, ГОНАР, АЙЧЫНА...

працяг з 3-й старонкі

польскія біскупы, але дзеля unікненьня яшчэ большых рэпрэсыяў спынілі сваю акцыю. Ліквідацыя кляштараў сустрэлася з крытыкай аўстрыяцкіх газэт, а менавіта “Salzburger Kirchenblatt[29]”, які апісваў брутальнасьць царысцкіх мэтадаў у барацьбе з касьцёлам. Пры гэтым газэта выражала зьдзіўленьне наконт пазыцыі нямецкіх і ангельскіх выданьняў, якія рашуча абаранялі правы палякаў адносна царскага дэспатызму, цяпер аднак маўчалі[30].

(працяг будзе)

пераклаў і падрыхтаваў
А.Я. Стральцоў-Карвацкі

[1] літоўскі = вялікалітоўскі
[2] “Тырольскія Галасы”
[3] дысыдэнты – у тагачасным разуменьні іншаверцы
[4] “Амбасадар”
[5] Вэнцэль Антон Каўніц – Канцлер Аўстра-Вугорскага Цэсарства
[6] русінскі=украінскі
[7] “Ґмінная газэта”
[8] “Прэса”
[9] “Айчына”
[10] пад царскім рондлем = под царским колпаком (маск.)
[11] “Gemeindezeitung” (Ґмінная ґазэта) ад 19.03.1863
[12] забор – зона акупацыі
[13] Хто ня верыць, што гэта быў менавіта лібэральна-атэістычны рух, няхай пагледзіць на сёньняшні гэрб Італіі, дзе ў цэнтры красуе залатая пяціканцовая зорка у абрамленьні лаўровага вянка. Ці гэта не нагадвае нешта вельмі знаёмае?
[14] Рух быў інстытуцыянальна запачаткаваны Напалеонам Банапартам, які ўтварыў спачатку Цызальпінскую Рэспубліку (1801), потым Італьянскую Рэспубліку (1802) і ўрэшце Італьянскае Каралеўства (1805), коштам тэрыторыяў Аўстра-Вугорскай манархіі
[15] Захаваўчы = кансэрватыўны, старарэжымны
[16] Чытай: “Рэлігійныя і сацыяльныя погляды Канстантага Каліноўскага” “Літва” N 1(13) 2002 г.
[17] “Wiener Kirchenzeitung” (Венская Касьцельная Ґазэта) ад 25.02.1863
[18] “Цsterreichischer Volksfreund” (Аўстрыяцкі Сябра Люду) ад 15.03.1863
[19] “Wiener Kirchenzeitung” ад 25.02.1863
[20] “Postęp” (Прагрэс – польская ґазэта ў Вене) ад 15.04.1863
[21] “Цsterreichischer Volksfreund” ад 7.10.1863
[22] “Wiener Kirchenzeitung” ад 13.05.1863
[23] “Цsterreichischer Volksfreund” ад 8.10.1863
[24] Масакра = рэзь
[25] “Інсбруцкія Ведамасьці” ад 18.08.1863
[26] “Sonntagsblatt fьr alle Stдnde” (Нядзельны Лісток для ўсіх Станаў) ад 19.07.1863
[27] “Der Botschafter” ад 10.12.1864
[28] водле Новага (Грэгарыянскага) стылю
[29] “Зальцбурскі Касьцельны Лісток”
[30] На нашу думку гэты момант як раз паказальны для ідэалягічнага разлому які існаваў паміж лібэральнымі сіламі і кансэрватыўна-традыцыяналістычнымі

НАША ВЕРА

# Мадэрнізм, альбо Француская Рэвалюцыя ў Касьцёле

працяг з 5-й старонкі

няма куды. У Заходняй Нямеччыне паводле словаў Кардынала Хёфнэра 93% каталікоў больш не спавядаюцца. За 1968-78 гг. наведваньне багаслужбаў у Заходняй Нямеччыне зьнізілася на 3 мільёны чалавек. У 1979 г. у Канадзе было зарэгістравана 48000 каталіцкіх шлюбаў. У той жа час 2900 шлюбаў распаліся, г.зн. каля 6%. У 1982 г., гзн. тры гады пазьней у той жа краіне было зарэгістравана 38000 шлюбаў – на 10000 меней, а 21000 шлюбаў распаліся, г зн. 56%. У ЗША колькасьць разводаў сярод каталікоў штогод павялічваецца больш чым на 1 мільён. У Галяндыі, пачынаючы з II Ватыканскага Сабору колькасьць высьвячэньняў у ксяндзы зьнізілася на 95%, у Аўстрыі прыкладна на 70%. У Аўстрыі статыстыка паказвае, што 98% каталікоў ва ўзросьце да 35 год уважаюць касьцельнае навучаньне аб маралі як неабавязковае.



*Трыдэнцкая Імша - найхвалябнейшы абрад Боскай Ахвяры таксама была аддадзена ў ахвяру пасьлясаборным рэформам*

Нарэшце прыйшоў час зрабіць высновы: без пераадоленьня мадэрнізму і яго праяўленьняў у актуальным навучаньні Касьцёла немажліва спыніць і пераадолець катастрафічную сытуацыю з вызнаньнем каталіцкай веры. Мадэрнізм асабліва небясьпечны ў параўнаньні са звычайнай гэрэзыяй тым, што ён ня мае жорсткіх і лягічных прынцыпаў, а таму вельмі цяжка акрэсьліць наколькі мадэрніст яшчэ зьяўляецца каталіком, а наколькі не. Але адсутнасьць гэтых прынцыпаў і ёсьць адхіленьне ад веры, альбо проста нявер'е. Належыць паглядзець праўдзе ў вочы і ўрэшце адпаведна ацаніць плён II Ватыканскага Сабору, які дзякуючы сваім двухсэнсоўным фармулёўкам стаўся своеасаблівым прыкрыцьцём для дзейнасьці мадэрністаў. Усё, што не адпавядае іхняй канцэпцыі яны называюць "дасаборным" поглядам, кажучы, што існуе больш актуальнае вучэньне. Належыць зазначыць, што ў Касьцёла Каталіцкага няма больш ці менш актуальнага вучэньня, яно заўжды адно. А калі вынікае супярэчнасьць па тым ці іншым пытаньні, належыць яго спраўдзіць на згоднасьць із цэлай, непарыўнай і вечнай традыцыяй Касьцёла Каталіцкага, а не з гэрэтычнымі фармулёўкамі дадзенымі ў другой палове XX стагодзьдзя. Так дапамажы нам Бог!

**Якуб Шпрэнгэр**
**Гэнрык Інстыторыс**

---

[1] адыж – аднак (трасянка), гл. нова-ёрскага "Вялікалітоўска – расійскага" слоўніка Др. Яна Станкевіча, бачына 39.
[2] спасьцерагаці – назіраці, гл. сл. Байкова й Некрашэвіча.
[3] заблуданьне = істотная памылка = рас. заблуждение
[4] прасьвечаны = рас. просвещённый
[5] Vaticanum II = Другі Ватыканскі Сабор
[6] сынкрэтызм - спалучэньне ўсіх рэлігіяў, фактычна дэізм.
[7] гэты лічбавы шэраг паказвае, што нэгатыўныя тэндэнцыі прысутнічалі ў Касьцёле яшчэ да II Ватыканскага Сабору і таксама тое, што сродкі, якія выбраў Сабор для іх пераадоленьня аказаліся неадпаведнымі. Сабор зацьвердзіў катастрафічны стан.

ЛІСТАВАНЬНЕ

***Зьмяшчаючы ў гэтым нумары "Літвы" допіс у рэдакцыю Ягамосьці Ўладзімера Якімовіча , мы падаем таксама водгук рэдакцыі.***

## *Погляд старога ліцьвіна на манархізм і на рэлігійныя дачыненьні*

На працягу гісторыі чалавецтва дужа многа адбылося малых і вялікіх бедаў толькі таму, што людзі па рознаму ставіліся да рэлігійных догмаў, ды й да розных рэлігіяў. Часам людзі мелі й аднолькавую любоў да Бога, а то й яшчэ горш – у стане пакрыўджанага быў чалавек больш адданы Богу, а крывадушныя, крываЖэрныя пошасьці, хаваючы за ймя Бога свае пачварныя помыслы, рабілі добрым людзям зло: зьдзяйсьнялі свае бізнэсоўскія, ці палітычныя памкненьні.

Зь гісторыі мы добра ведаем аб дзеяньнях Лівонскага ордэну, які зь імем Бога рабаваў латыскіх, эстонскіх сялянаў, захопваў землі Полацкага княства. Калі ў адносінах да ліваў, латгалаў і інш. "нехрысьцяў" яны прыкрываліся шчытом "нясем паганцам слова Хрыстова" (а чаму так гвалтоўна?), то чым патлумачыць захоп імі зямлі Полацкага княства, ужо хрысьціянскага? Хіба гэта не палітычныя мэты Ватыкану? А Тэўтонскі вордэн? У ймя палітычных мэтаў зьнішчалі, гвалцілі насельніцтва Прусіі, у ліку якога былі як прусы, так і літоўцы, палякі, жамойты. А потым, бесперапынныя спробы захопу земляў Навагародчыны, Літвы ды й Польшы, не зважаючы, што яны былі хрысьціянскімі. Гэта доўжылася да 1410 году, пакуль у нюх не надавалі "братам хрысьціянам". І зноў палітычныя мэты агрэсыйных сіл Ватыкану, а далёка не рэлігійныя клопаты пра "блукалых ягнятаў".

Пачынаючы з 15 ст. ідуць амаль бесперапынныя войны з Масковіяй, і ў васноўным, пад рэлігійным шчытом: "дапамога братом праваслаўным рускім", пры гэтым зьнішчалі іх (братоў праваслаўных) амаль пагалоўна.

А колькі праліта крывухны ў ВКЛ у спрэчках, хто больш варты ў Бога католік ці праваслаўны. А колькі пыхі ў спрэчках – чыя вера больш дагодная Богу. Камусьці яшчэ й сёньня здаецца, што трэба даводзіць кулакамі сваё верхавенства адданасьці Богу. Дзікунства 21 ст. Ня дзіва, што дзяржаўныя ўлады 14 ст. пісалі зусім недарэчныя Загады, нават правакацыйныя, аддаючы перавагу вернікам каталіцкага веравызнаньня. Вынік? Ад паўстаньня да пасыйнага стаўленьня праваслаўных да барацьбы з Масковіяй, а часам і падтрымка Масковіі. Вось вам.

Крочыць па шляху, прапанаваным газэтай "ЛІТВА" – небясьпечна й шкодна для дэмакратычнага руху, таму, што ён (шлях) – правакацыйны. Нельга падзяляць людзей на "патрыётаў", "нацыяналістаў" ды іншыя глупствы ў залежнасьці веравызнаньня, мовы. Сьмеху варта: " ліцьвін – той хто гэта выразна дэкляруе". Шаноўнейшыя, ад таго, што вы сябе задэкляруеце мазамбікцам, вы ім ня станеце, як ня дзьміцеся. Спадарства, хто зь гісторыі ня робіць высноваў – бязглузды чалавек.

Хто здольны аналізаваць і ведае гісторыю ВКЛ, Рэчы Паспалітай той цудоўна ўсьведамляе сабе: чаму здарылася тое , што мы зараз маем. Ня толькі вонкавыя прычыны былі ў заняпадзе нашых Дзяржаў, а галоўным чынам – унутраныя. Грызьліся як сабакі па кожным пытаньню, а колькі пыхі ў кожнага, нават неданошанага шляхціца, працістаўленьне сябе ўсім. А пра любоў да свайго брата хрысьціяніна й гаварыць не даводзіцца. Суцэльны гвалт. Пошук свайго адметнага шляху – царкоўная Унія. І зноў супрацію – гвалт. Пара зразумець, што нельга гвалтам гнаць нават у рай. Толькі ляяльнасьць, памяркоўнасьць, шлях свабоднай і дабрахвотнай духоўна-культурнай інтэграцыі паміж захадам і ўсходам дапамагае захаваць сяброўства, паразуменьне. Гэта

ЛІСТАВАНЬНЕ

прапагандавалі Пётар Магіла, Сільвестар Косаў, Ісая Казлоўскі, Мялет Сматрыцкі, Ф.Скарына, М.Гусоўскі, В.Цяпінскі, С.Будны, Л.Сапега, А.Волан, можа хопіць пералічваць нашых нацыянальных сьветачоў, каб было пераканаўча. Галоўнае, на што яны зьвярталі ўвагу – на неабходнасьць захаваньня палітычнай незалежнасьці, этнічнай, рэлігійнай (дарэчы, усе яны былі прыхільнікамі аўтакефальнай праваслаўнай Царквы ВКЛ, як і я) і духоўнай адметнасьці народу. Як толькі зьяўляюцца ноткі пагарды аднаго этнасу, або адной рэлігіі да іншай, так немінуча прыходзіць падзел грамадства на “чыстых і чысьцейшых, на патрыётаў і не, на нацыяналістаў і не”, ну й падобная брэдзь.

Няма на нашай зямлі “чыстых этнасаў”. Амаль усе гісторыкі знаходзяць паразуменьне ў паходжаньні беларусаў і Беларусі. Тэрыторыя сёньняшняй Беларусі была калісьці заселенай балтамі. Паступова нараджаецца новы этнас: славяна-балцкі. Гэты этнас адрозьніваецца й ад балтаў і ад славян, і таго ж часу – родны ім...Якая наша назова павінна быць? Літоўцы ці беларусы? Зыходзячы зь гісторыі разьвіцьця этнасу й яго ўспрыманьня ў сьвеце на працягу дастаткова доўгага часу мы – літоўцы.

Але, спадарства, ня трэба ўсё валіць у вадну кучу: “калі праваслаўны становіцца грэка-католікам, ён аўтаматычна трапляе ў катэгорыю хаця б “пасыўных літвінаў”. Апроч як глупствам і правакацыяй гэта назваць нельга. Гэта ўжо ўсё праходзілі, пачынаючы з 1380 году. Вынік – жахлівы. На якой падставе вы вылучаеце каталіцызм, як больш “правільную” рэлігію, да “няправільнай” рэлігіі вы ж ня будзеце заклікаць.

А ці ведаеце вы, як ворагі Сьвятасьці ставяцца да рэлігіяў? Пачытайце кніжку Сяргея Нілуса “Близ есть при дверях “, Сергіев Посад, 1917 г., у якой выкладзена праграма дзеяньняў «Светлейшего Великого Собрания Заслуженных Масонов», распрацаванай 9-15.08. 1871 г. З гэтай праграмы вынікае, што масоны лічаць што яны ўжо многага дасягнулі ў справе “просвещения” індыйскай групы, маюць вялікую надзею на магаметан, і ўпэўненыя, што каталіцызм увесь час здае свае пазыцыі. Найбольш пасьлядоўнымі лічаць “праваслаўных”. Гэткія акцэнты яўных служак Сатаны прымушаюць задумацца. Таму ня трэба блытаць рэлігійныя пытаньні з этнічнымі. І наогул, не кранайце рэлігійных пытаньняў у пляне параўнаньня рэлігіяў. Няма добрых і дрэнных рэлігіяў. Усе рэлігіі – шлях да Бога. А вось той хто йдзе па гэтым шляху можа й збочыць, і зазірнуць да Сатаны. Асьцярожна!

А для нас, літвінаў паводле крыві, галоўнае: любоў да Бога, а гэта й адно да ваднога, узаемадапамога, узаемапавага, любоў да Радзімы, веданьне ейнай гісторыі, ейнай мовы, праца дзеля росквіту Радзімы, рашучая барацьба з ворагамі Радзімы – вось неабходныя й дастатковыя ўмовы каб быць патрыётам, нацыяналістам, грамадзянінам любай Радзімы – Вялікага Княства Літоўскага, пад кіраўніцтвам веча (накшталт Полацкага), а князёў нам хопіць, гэты надакучыў, а лепшага ня будзе.

Пра мову й алфавіт. Можна пагадзіцца, што сёньняшняя мова задужа зрусіфікаваная. Хай навукоўцы папрацуюць у гэтым кірунку, але з улікам таго, што мы жывем ужо ў 21 ст., а не ў 16 ст. У ваду таго Рубону нам ужо не зайсьці, як бы не хацелася, яна ўжо й змяшалася з вадой Палаты, Вушачы, Дзісны й даўно зьбегла. Алфавіт. Божухна, колькі ўжо напісана гэтым алфавітам і якія знакамітасьці нашыя не пісалі ім. Скарына, Цяпінскі, Сматрыцкі, Еўфрасіньня Полацкая, С.Полацкі, С.Будны, Я.Купала, Я.Колас, Кузьма Чорны і многа – многа яшчэ хто. Запытайцеся іх. Калі лянуецеся іх запытаць, то зьвярніцеся да Барадуліна, Быкава, Г.Бураўкіна, Гілевіча, Алексіевіч...

**Уладзімір Якімовіч**

**з Маладэчна.**

# Водгук Рэдакцыі

Адказваючы на допіс Ягамосьці Ўладзімера, хацелася б адзначыць, што мы зыходзім з пазыцыі рэалізму не ідэалізуючы тую, ці іншую эпоху, а трымаючыся трывалай дзяржаўнай традыцыі, якая была спраўджанаю жыцьцём.



Што тыча адданасьці дагматам і праўдзівай веры, дык для нас яны непадзельныя. Чалавек, які верыць, мусіць быць адданы прынцыпам і сваймі ўчынкамі сьведчыць пра гэта. Але ня йдэалізуйма паганцаў X-XIII стст, якімі былі ў значнай частцы нашыя продкі. Яны ня былі анёламі, зь якімі можна было дамовіцца аб пакаёвым распаўсюдзе веры й весьці такі “дэмакратычна-экумэнічны” дыялёг. Таму ўсталяваньне Ордэну Найсьвяцейшай Марыі Панны (Тэўтонскі) не магло б насіць негвалтоўнага характару. Рабаўніцкія наезды малі двохбаковы характар. Гэтак сама як тэўтонцы наяжджалі наш край, наяжджалі Польшчу ці валоданьні Ордэнавы Давыд Гарадзенскі ці Кейстут. Пан Бог заўсёды абірае адэкватныя сродкі навяртаньня. Тут гэта адбылося водле прынцыпу “ад супраціўнага”, пакуль ты ня йімаўся каталіцкае веры, будзеш пакутваць праз наезды суседавы. Як толькі нашы Вялікія Князі Ягайла й Вітаўт імаліся каталіцкай веры й замірыліся, адбылася Грунвальдзкая перамога – чым ня цуд Божы!

Што ж да пытаньня пра йснаваньне славян і асыміляцыю імі балтаў, то мы стаімо на груньце дзяржаўніцкага або гаспадарстваватга прынцыпу, водлуг якога менш істотна хто каго і калі асымляваў, але важна хто якому пану чы Гаспадару служыў. Згодна з гэтым мы безумоўна Літвіны.

Што тыча сярэднявечных рэлігійных дыспутаў, то мы стаімо на грунце, што Пан Бог, стварыўшы чалавека на свой вобраз і падабенства, надаў яму дар пазнаньня аб'ектыўнае праўды. Таму мы ня можам уважаць, што ўсі рэлігіі вядуць да Бога, бо яны вымоўна супярэчаць адна ваднэй. Што тыча праваслаўя, якое дагматычна найбліжэй каталіцызму, дык трэ мовіць, што Кіеўскі Князь Уладзімер хрысьціўся й хрысьціў Русь у годзе 988 ад нараджэньня Хрыстовага, у вадзіную вапостальскую, каталіцкую й прававерную (праваслаўную) веру. Адкол Канстантынопальскага Патрыярхату вадбыўся ў 1054 р. Дык кім жа

працяг на 8-й старонцы

ЛІСТАВАНЬНЕ

# Водгук Рэдакцыі

працяг з 5-й старонкі

тады быў Князь Уладзімер? Каталіком бізанцкага вабраду, альбо Ўніятам! Хто ж тады здрадзіў веры бацькоў?

Крочыць нашым шляхам мы будзьма незалежна таго, хто б чаго ні казаў. Мы не падзяляем людзёў, але задзіночваем іх паводле дакладных прынцыпаў. А з "дэмакратычнай" аморфнай масай немажліва адказаць на гэныя выклікі, якія пастаўленыя нашаму краю. Слова "дэкляруе" пазначае што кожны, незалежна этнічнага паходжаньня, але падзяляючы нашыя рэлігійна-маральныя прынцыпы можа быць Літвіном.

Чаму нашым веравызнаньнем Літвінаў ёсьць каталіцкае? Таму што наша дзяржаўная традыцыя, якая ёсьць цудам Божым, давяла што пад аховай каталіцкай веры наша Гаспадарства – Вялікае Княства Літоўскае – праіснавала амаль 400 рокаў. Пад паганствам блізу 150. А пад праваслаўем, дарма што малі асобны патрыярхат – аніколі. Унія была нічым іншым, як выпраўленьнем ранейшай памылкі праваслаўнай люднасьці ВКЛ і вяртаньнем да веры Раўнаапостальнага Кіеўскага Князя Ўладзімера, да веры Эўфрасіньні Полацкай, якія ніколі ад Рыму не адпадалі! Дынастыя Вялікіх Князёў Літоўскіх – Ягайлавічаў-Ягэлёнаў, а потым элекцыйныя Вялікія Князі былі каталіцкімі. Якія шчэ сьведчаньні неабходныя для таго, каб сьцьвердзіць, што ў ВКЛ паноўным веравызнаньнем было каталіцкае. На іншае пытаньне, а менавіта, чаму мы ўважаем каталіцкае веравызнаньне адзіна правільным, можна адказаць: проста мы ў гэта верым! Наша вера будуецца на тысячах прыкладаў сьвятых, кананізаваных Касьцелам. Раім Вашмосьці азнаёміцца з апісаньнем Жыцьця Сьвятых.

Наконт зьвесткаў, якія прыводзіць Ягамосьць Уладзімер тычна нашых нацыянальных сьветачаў, неабходна адзначыць, што хутчэй за ўсё пратэстантамі былі М.Гусоўскі, В.Цяпінскі й дакладна арыянінам - С.Будны. Леў Сапега быў напачатку праваслаўным, потым пратэстантам, а ўрэшце ўніятам і зафундаваў вялікую колькасьць уніцкіх сьвятыняў. Веравызнаньне Францішка Скарыны да сёньня дакладна нявызначанае. Таму цяжка адказаць наколькі гэтыя асобы былі прыхільнікамі аўтакефальнай праваслаўнай Царквы ВКЛ.

Што тыча ноткаў пагарды, трэба вызначыць што ёсьць пагардай, а што рэлігійным дыспутам. Калі мы кажам, што верым і ўважаем, што рэлігія каталіцкая ёсьць адзіна праўдзівай, дык гэта ёсьць Сымболем нашай каталіцкай веры, які мы з гонарам вызнаем, а не пагарда да іншых веравызнаньняў. Такім сама чынам уважаюць і праваслаўныя, маючы на ўвазе сваю канфэсыю. Дарэчы слова канфэсыя паходзіць



ад лацінскага confessio, што знача вызнаньне веры. Бяз гэтага элемэнту ніякая вера немажлівая. Тое чаго прапануе Ягамосьць Уладзімер, а менавіта тэзу, што ўсі рэлігіі вядуць да Бога, азначае адсутнасьць адзінага вызнаньня веры, а знача яе адсутнасьць, альбо што тое ж самае – атэізм. Дарэчы гэткай сама тэзы трымаюцца згаданыя Ягамосьцем Уладзімерам масоны.

Што тыча закіду аб тым, што Касьцел "здае" свае пазыцыі стасоўна масонства, трэ адказаць наступным чынам. Няхай Ягамосьць Уладзімер задасьць сабе клопат бліжэй азнаёміцца зь гісторыяй Эўропы XVIII-XX стст. Палова біскупаў і колькі тысяч ксяндзоў было замарадавана падчас Францускай Рэвалюцыі; гвалтам, а менавіта праз рэвалюцыю ўсталёўвалася антыпапеская, лібэральная й прамасонская Італьянская Дзяржава; велізарны ціск на Касьцел чыніла антыкаталіцкая й масонская Ангельшчына; за часоў гішпанскай чырвонай рэвалюцыі 30-х гадоў XX ст. было зьнішчана каля 40 000 духоўных асобаў. Пасьля таго, як у Касьцела забралі ўсе магчымасьці ўплыву, Ягамосьць Уладзімер рытарычна пытаецца, чаму Касьцел здае пазыцыі!? Але не хвалюймася, брамы пекла Касьцелу не перамогуць і сьведчаньнем гэтаму 2000-рочная гісторыя.

Што да мовы 16-га старочча й ейнага мейсца ды ролі цяпер, то варта пацікавіцца творамі й слоўнікамі дохтура Яна Станкевіча – ляпей за гэнага Навукоўца пакуль ніхто не папрацаваў.

Нарэшце закранаючы апошняе: альфабэт. "Літва" выдаецца ў дзьвюх графіках: кірыліцай і лацінкай, чаго можна тут дадаць.

*Ня мір я прынес, але меч*

# Справа Годнасьці

Тут зашмат праваслаўных крыжоў,
Не патрэбных, ня малых на права –
Быццам зграя драпежных крукоў
Панад полям дзе гінула слава.

Тут каналі за Волю Дзяды
Пад унійнымі Рыму крыжамі,
Захлынаючыся у крыві
Пад казакамі ды крымчакамі.

Але зьведала цела Зямлі
Катаваньняў кацапскай пачвары –
І паўсталі чужыя крыжы
А "бажніцы" ўпаўзьлі павукамі.

Павучыньне ўкол шыяў цісьне,
На калені усіх прыгінае –
Пад уладу маскоўскай руцэ
На слухмяных рабоў!
На слухмяных рабоў!
На слухмяных рабоў!
Усіх ператварае.

Падыймуй жа ж, мой Брацітка, меч!
Нас чакае сьвятарная справа –
Падрузгаць а павыкінуць прэч,
Каб ня гідзіла земляў пачвара!

Хай зазьзяя сьвятым каганцом
Роднай Уніі кветка-вакраса –
Хай руняя пад Боскім скрыдлом
На Зямлі на Маёй!
На Зямлі на Маёй!
На Зямлі на Маёй!
Боская ласка...

*Пан Ськівгайла Палянэцкі.*

***Газэта «Літва» была адноўлена ў 1995 р. Да 1998 р. у рэдакцыю ўваходзілі Уладзімер Міхневіч, Аляксандар Ян Стральцоў-Карвацкі і Уладзімер Пятровіч. З 1999 р. склад рэдакцыі зьмяніўся і гэты нумар падрыхтавалі:***

***Рэдактар:*** ***Аляксандар Ян Стральцоў-Карвацкі***
***Карэктура:*** ***Аляксандар Ян Стральцоў-Карвацкі***
***Пан Ськівгайла Палянэцкі***
***Вёрстка:*** ***Марцін Койдан***

***Нашы прынцыпы і як нас знайсьці:***

Рэдакцыя газэты друкуе матэрыялы з мэтай забезпячэньня свабоднага пераплыву інфармацыі, бяз згоды аўтараў і не нясе адказнасьці ў адпаведнасьці з заканадаўствам аб аўтарскіх правох, у сувязі з адсутнасьцю прававое дзяржавы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Адказныя за дакладнасьць фактаў, пададзеных у артыкулах суць аўтары публікацый. Рэдакцыя мае права на стылёвае і граматычнае рэдагаваньне аўтарскіх матэрыялаў.

*Паштавая скрынка:*
п/с 26, 220050 Менск-Літоўскі
Рэч Паспалітая Літва - Res Publica Lithvania
e-mail: litva@adukatar.lingvo.minsk.by